УДК 376.1

*У. С. Ваўчанкоў*

# ДЫЯГНАСТЫЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ПСІХАЛОГІЯ РАЗВІЦЦЯ») ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ І ІНКЛЮЗІЎНАЙ АДУКАЦЫІ ДА ФАРМІРАВАННЯ У ВУЧНЯЎ МЕТАПРАДМЕТНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ Ў АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ

Прапануецца вызначэнне і змест метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў ва ўмовах спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі. Абмяркоўваецца пытанне неабходнасці распрацоўкі дыягнастычнага суправаджэння для падрыхтоўкі педагогаў спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі да фарміравання ў навучэнцаў метапрадметных кампетэнцый. Прыводзіцца прыклад выкарыстання індыкатараў (крытэрыяў і паказчыкаў) для ацэнкі ўзроўню сфарміраванасці базавых прафесійных кампетэнцый.

***Ключавыя словы:*** кампетэнцыі, метапрадметныя кампетэнцыі, псіхолага-педагагічныя кампетэнцыі, спецыяльная і інклюзіўная адукацыя, кантрольна-вымяральныя матэрыялы.

*U. Vauchankou*

# DIAGNOSTIC SUPPORT (ON THE EXAMPLE OF A SUBJECT "DEVELOPMENTAL PSYCHOLOGY") PREPARATION OF THE FUTURE TEACHER OF SPECIAL AND INCLUSIVE EDUCATION TO THE FORMATION OF METASUBJECT COMPETENCE IN LEARNERS IN THE EDUCATIONAL PROCESS

The definition and content of metasubject competences of students in the context of special and inclusive education is proposed. The issue of the need to develop diagnostic support for training teachers of special and inclusive education for the formation of meta-subject competencies in students is discussed. An example of the use of indicators (criteria and indicators) to assess the level of formation of basic professional competencies is given.

*Keywords:* competencies, metasubject competences, psychological and pedagogical competencies, special and inclusive education, control and measuring materials.

Сучасная парадыгма спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі прадугледжвае, што ў дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў працэсе навучання павінны быць сфарміраваны асабістыя і метапрадметныя кампетэнцыі, каб выпускнік установы адукацыі быў гатовы і здольны да вырашэння розных арганізацыйных, пазнавальных і камунікатыўных задач. У сувязі з гэтым асаблівую значнасць набываюць пытанні, якія тычацца падрыхтоўкі будучых педагогаў спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі да фарміравання метапрадметных кампетэнцый у навучэнцаў.

Як правіла, пад метапрадметнымі кампетэнцыямі навучэнцаў разумеюць сістэму ўніверсальных вучэбных дзеянняў, якія спрыяюць прадуктыўнаму выкананню рэгулятыўных, пазнавальных і камунікатыўных задач. З гэтага

вынікае, што можна вылучыць рэгулятыўную, пазнавальную і камунікатыўную кампетэнцыі [1].

Рэгулятыўная кампетэнцыя вызначаецца сфарміраванасцю адвольнасці паводзін, умення мэтанакіравана і планамерна кіраваць сваей дзейнасцю і паводзінамі, што у сваю чаргу забяспечваецца псіхалагічнай гатоўнасцю ў сферы волі і адвольнасці.

Пазнавальная кампетэнцыя забяспечваецца ўменнем самастойна вызначаць і фармуляваць пазнавальную мэту, здольнасцю знаходзіць і выдзяляць неабходную інфармацыю, знаходзіць патрэбныя спосабы рашэння задач, уменнем вылучаць праблему і г. д.

Камунікатыўная кампетэнцыя ўключае ў сябе ўменне слухаць і чуць суразмоўцу; уменне кантраляваць дзеянні, размяркоўваць ролі; здольнасць граматна размаўляць, весці дыялог і дыскусію; узаемную павагу ў зносінах.

Фарміраванне метапрадметных кампетэнцый ажыццяўляецца ў працэсе выканання розных відаў дзейнасці ў ходзе навучання і выхавання і абавязкова грунтуецца на ўліку ўзроставых асаблівасцяў развіцця асобы вучняў.

Найбольш эфектыўнымі ў фарміраванні метапрадметных кампетэнцый з'яўляюцца наступныя адукацыйныя тэхналогіі і прыемы: стварэнне праблемнай сітуацыі; фарміраванне паняццяў; гіпотэзы і пытанні; фарміраванне спосабаў дзейнасці; назіранне і эксперымент; вылучэнне важнай інфармацыі ў тэксце; арганізацыя групавой работы; самакантроль і самаацэнка.

У ходзе падрыхтоўкі педагогаў спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі да фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый у навучэнцаў можна выкарыстоўваць мадэль, якая складаецца з наступных блокаў: мэтавы, арганізацыйна-змястоўны і ацэначна-выніковы. Таксама можна вылучыць асноўныя разнавіднасці метапрадметных кампетэнцый, якія павінны быць сфарміраваны ў педагога спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі ў рамках рэалізацыі метапрадметнага падыходу:

- прадметна-метадалагічная кампетэнцыя;
- кампетэнцыя кіравання якасцю прафесійнай дзейнасці;
- псіхолага-педагагічная кампетэнцыя;
- кампетэнцыя па выкарыстанні здароўезберагаючых тэхналогій у адукацыйным працэсе;
- камунікатыўная кампетэнцыя.

Спынім нашу ўвагу на сутнасці псіхолага-педагагічнай кампетэнцыі сучаснага педагога спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі і ахарактарызуем яе складнікі:

- кагнітыўны складнік вызначаецца сфарміраванасцю і сістэматызаванасцю ведаў аб унутраных вучэбных рэсурсах вучняў ў цэлым, аб псіхалагічных асаблівасцях асобы і пазнавальных здольнасцях асобных навучэнцаў, а таксама аб развіцці іх матывацыйнай і эмацыйна-валявой сфер;
- аперацыйна-тэхналагічны складнік уключае валоданне педагогам уменнямі вызначаць ступень сфарміраванасці і развіцця пазнавальных здоль-

насцяў кожнага навучэнца, здольнасць выкарыстоўваць гэтыя веды для арганізацыі адукацыйнага працэсу;

- асобасны складнік уключае наяўнасць у педагога канструктыўнай пазіцыі пры ацэнцы пазнавальных здольнасцяў навучэнцаў, гэта значыць перакананасць у тым, што пазнавальныя здольнасці могуць быць развіты, адукацыйны працэс можа і павінен быць эфектыўным для ўсіх навучэнцаў незалежна ад асаблівасцяў іх псіхафізічнага развіцця.

Ацаніць узровень сфарміраванасці прафесійных кампетэнцый у будучых педагогаў можна, выкарыстоўваючы такія метады, як тэсціраванне, карты самааналізу, назіранне (у тым ліку саманазіранне), субяседаванне, сітуатыўныя задачы, фрагменты навучальных і / або выхаваўчых заняткаў.

Але, паколькі кампетэнцыі не з'яўляюцца наборам прадметных ведаў і ўменняў, то абмяжоўвацца традыцыйнымі кантрольна-вымяральнымі працэдурамі ў форме звыклых тэставых заданняў з выбарам адказаў не ўяўляецца магчымым. Патрабуецца распрацоўка ацэначных сродкаў, пабудаваных на аснове сучасных дасягненняў тэорыі, якія праяўляюцца толькі ў адпаведных відах практычнай дзейнасці навучэнцаў. Для рэалізацыі названай задачы найбольш прыдатнымі з'яўляюцца комплексы кампетэнтнасна арыентаваных заданняў па вывучаемых вучэбных дысцыплінах.

Вучэбная дысцыпліна «Псіхалогія развіцця», згодна з праектам адукацыйнага стандарту спецыяльнасці «Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя», забяспечвае фарміраванне наступных базавых прафесійных кампетэнцый:

БПК-1. Валодаць сістэмай ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці ў сферы інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, разумець інавацыйныя працэсы ў адукацыі.

БПК-3. Умець праектаваць карэкцыйна-адукацыйны працэс, адбіраць метады, формы, тэхналогіі, адпаведныя карэкцыйна-адукацыйным мэтам і задачам, з улікам накіраванасці асобы навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і прыярытэтаў выхаваўчай работы.

Прывядзем прыклад выкарыстання індыкатараў (крытэрыяў і паказчыкаў) для дыягностыкі ўзроўню сфарміраванасці базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК-1. Валодаць сістэмай ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці ў сферы інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, разумець інавацыйныя працэсы ў адукацыі.

Крытэрый 1: веданне асноўных узроставых псіхалагічных асаблівасцяў навучэнцаў розных ступеняў атрымання агульнай сярэдняй адукацыі.

Паказчыкі (індыкатары) сфарміраванасці названага крытэрыя.

1.1 Пазнае ўзроставыя псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў розных узростаў з прапанаванага пераліку – нізкі ўзровень (4–5 балаў);

1.2 Называе, пералічвае і характарызуе ўзроставыя псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў розных узростаў, прадстаўленыя ў сітуацыйных заданнях – сярэдні ўзровень (6–8 балаў);

1.3 Разумее прычыны праявы ўзроставых псіхалагічных асаблівасцяў у навучэнцаў розных узростаў, прадстаўленыя ў сітуацыйных заданнях, пра-

пануе варыянты вырашэння праблемных сітуацый з улікам узроставых асаблівасцяў навучэнцаў – высокі ўзровень (9–10 балаў).

Крытэрый 2: уменне ажыццяўляць эфектыўны адукацыйны працэс ва ўмовах інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, выкарыстоўваючы інавацыйныя падыходы ў адукацыі з улікам узроставых псіхалагічных асаблівасцяў навучэнцаў.

Паказчыкі (індыкатары) сфарміраванасці дадзенага крытэрыя.

2.1 Ведае асноўныя метадычныя прыемы і спосабы арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, называе інавацыйныя падыходы ў адукацыі – нізкі ўзровень (4–5 балаў);

2.2 Дае ацэнку выкарыстоўваемым прыемам і спосабам арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, эфектыўнасці інавацыйных падыходаў у адукацыі – сярэдні ўзровень (6–8 балаў);

2.3 Тлумачыць і прагназіруе вынікі выкарыстоўваемых прыемаў і спосабаў арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, эфектыўнасць інавацыйных падыходаў у адукацыі. Прапануе альтэрнатыўныя варыянты арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах інклюзіўнай і спецыяльнай адукацыі, выкарыстання інавацыйных падыходаў у адукацыі – высокі ўзровень (9–10 балаў).

Такім чынам, распрацоўка кантрольна-вымяральных матэрыялаў у выглядзе комплексаў кампетэнтнасна арыентаваных заданняў для ацэнкі ўзроўню сфарміраванасці прафесійных кампетэнцый педагогаў і метадычных рэкамендацый па ўжыванні гэтых матэрыялаў дапаможа павысіць якасць прафесійнай падрыхтоўкі ва ўстановах вышэйшай педагагічнай адукацыі.

## Спіс літаратуры

1. Зеер, Э. Ф. Кампетэнтнасны падыход да адукацыі / Э. Ф. Зеер // Адукацыя і навука. – 2005. – № 3 (33). – С. 27–35.